Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Маладзечанская сярэдняя школа № 1 імя Янкі Купалы”

# АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ “ПАВЫШЭННЕ ВУЧЭБНАЙ МАТЫВАЦЫІ ВУЧНЯЎ V–VIII КЛАСАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ІНТЭРАКТЫЎНЫХ МЕТАДАЎ І ПРЫЁМАЎ НАВУЧАННЯ”

Новік Алена Валер’еўна,
настаўнік беларускай мовы
і літаратуры
8 (029) 5751745;
e-mail: volodya.novik.1970@mail.ru

## *1 Інфармацыйны блок*

### 1.1.Тэма вопыту

Павышэнне вучэбнай матывацыі вучняў V–VIII класаў на ўроках беларускай мовы праз выкарыстанне інтэрактыўных метадаў і прыёмаў навучання.

### 1.2. Актуальнасць вопыту

Праблема павышэння вучэбнай матывацыі навучэнцаў мае асаблівае значэнне на сучасным этапе адукацыі, так як уплывае на якасць адукацыі. У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі дадзена наступнае тлумачэнне якасці адукацыі: “адпаведнасць адукацыі патрабаванням адукацыйнага стандарту, вучэбна-праграмнай дакументацыі адпаведнай адукацыйнай праграмы” [5, с. 3]. Згодна з Адукацыйным стандартам базавай і сярэдняй адукацыі, патрабаваннямі да якасці навучання вывучэнне прадмета “Беларуская мова” прадугледжвае фарміраванне ў вучняў “вучэбна-пазнавальных кампетэнцый, кампетэнцый сацыяльнага ўзаемадзеяння, камунікатыўнай кампетэнцыі”, таму пры навучанні беларускай мове ў цэнтры ўвагі павінен быць “вучань як суб’ект, які зацікаўлены ў пазнанні, вывучэнні разнастайных законаў беларускай мовы і правіл карыстання ёй” [1, с. 36 – 37].

На маю думку, праблема павышэння матывацыі, а адпаведна актывізацыі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, заўсёды была адной з найбольш актуальных у тэорыі і практыцы навучання. У пошуках шляхоў яе вырашэння педагогі працягваюць асвойваць новыя метады і нестандартныя формы правядзення вучэбных заняткаў. Для сучаснай педагагічнай навукі відавочна тое, што галоўнымі фактарамі развіцця асобы з'яўляюцца прадметна-практычная дзейнасць і ўзаемадзеянне паміж людзьмі. Актыўная пазнавальная дзейнасць вучняў на ўроках беларускай мовы станоўча ўплывае на матывацыю да вывучэння прадмета, забяспечвае паспяховасць і якасць атрымання ведаў. Пазнавальная дзейнасць фарміруе ў іх самастойнасць і іншыя асабовыя якасці, развівае актыўнасць і лагічнае мысленне.

Сустракаючыся на практыцы з нізкай актыўнасцю вучняў на ўроку, з адсутнасцю цікавасці да вывучэння беларускай мовы я пачала задумвацца, як дапамагчы такім вучням, як наладзіць з імі супрацоўніцтва.

Шырока вядома максіма: “Добра вучыцца той, хто жадае вучыцца”. Паводле данных псіхолагаў, многія вучні цягу да ведаў паступова губляюць у першым паўгоддзі. Праўда, трэба зрабіць адно ўдакладненне – дзеці не проста не жадаюць вучыцца. Яны не жадаюць вучыцца так, як ім прапаноўваюць. У мяне ўзнікала наступнае слушнае пытанне: чаму не жадаюць?

Зразумела, што прычыны розныя. Аднак я вырашыла, што на некаторыя з іх магу паўплываць. Не навіна, што звычайна з ахвотай і задавальненнем дзеці займаюцца тым, што ім падабаецца, да чаго адчуваюць цікавасць і схільнасць. Кожнаму хочацца праявіць сябе, дасягнуць поспеху. У выніку роздумаў аб тым, як зрабіць урокі цікавымі і захапляльнымі, каб у вучняў сапраўды ўзнікала жаданне пазнання нечага новага, а не чакання званка з урока, пачала выкарыстоўваць у вучэбнай дзейнасці інтэрактыўныя метады і прыёмы. І як паказаў уласны вопыт выкладання, пры інтэрактыўным рэжыме навучання, які прадугледжвае дыялог, кааперацыю і супрацоўніцтва ўсіх удзельнікаў працэсу, а таксама стварае камфортнае становішча на вучэбным занятку, сапраўды, актывізуецца пазнавальная дзейнасць кожнага вучня, улічваюцца яго інтарэсы і схільнасці. Пры гэтым я як педагог павінна не столькі навучыць, колькі матываваць вучня да далейшай адукацыі і самаадукацыі.

Актуальнасць майго вопыту заключаецца ў тым, што інтэрактыўныя метады і прыёмы навучання змяняюць форму перадачы ведаў на эўрыстычную, якая заснавана на дыялогу і ўзаемадзеянні, што стымулюе пазнавальную актыўнасць вучняў.

**1.3. Мэта вопыту**

У выніку выяўленай праблемы была вызначана мэта вопыту: стварэнне спрыяльных умоў для фарміравання вучэбнай матывацыі вучняў да навучання беларускай мове праз выкарыстанне інтэрактыўных метадаў і прыёмаў.

**1.4. Задачы**

1. Адабраць эфектыўныя інтэрактыўныя метады і прыёмы навучання, якія дапамагаюць павышаць вучэбную матывацыю вучняў.

2. Апрабаваць аптымальныя інтэрактыўныя метады і прыёмы для павышэння вучэбнай матывацыі на вучэбных занятках па беларускай мове.

3. Прааналізаваць эфектыўнасць і выніковасць прымянення інтэрактыўных метадаў і прыёмаў для павышэння станоўчай матывацыі вучняў да вучэбнага прадмета «Беларуская мова».

**1.5. Працягласць работы над вопытам**

Этапы работы над вопытам:

1 этап – падрыхтоўчы (вывучэнне літаратуры айчынных і замежных аўтараў, вопыту калег па праблеме інтэрактыўнай адукацыі, выяўленне ўзроўню сфарміраванасці матывацыі вучэбнай дзейнасці да вывучэння беларускай мовы ў навучэнцаў праз дыягностыку; вызначэнне, выбар, распрацоўка метадаў і сродкаў рашэння праблемы).

2 этап – практычнай рэалізацыі (стварэнне, прымяненне на практыцы інтэрактыўных метадаў і прыёмаў навучання, якія садзейнічаюць павышэнню вучэбнай матывацыі навучэнцаў).

3 этап – абагульнення вопыту (абгрунтаванне эфектыўнасці і выніковасці выкарыстання інтэрактыўных метадаў і прыёмаў на асобных этапах навучальнага занятку з мэтай павышэння вучэбнай матывацыі вучняў).

Работа па дадзенай тэме была распачата ў 2018/2019 навучальным годзе і працягваецца па гэты час.

## *2 Апісанне тэхналогіі вопыту*

**2.1. Вядучая ідэя вопыту**

Фарміраванне вучэбнай матывацыі з'яўляецца адной з цэнтральных праблем сучаснай школы. Яе актуальнасць абумоўлена абнаўленнем зместу адукацыі, пастаноўкай задач фарміравання ў навучэнцаў прыёмаў самастойнага набыцця ведаў, фарміравання ў іх актыўнай жыццёвай пазіцыі. У сучаснай педагогіцы матывацыя вучэбнай дзейнасці разглядаецца як агульная назва

для працэсаў, метадаў, сродкаў пабуджэння навучэнцаў да прадуктыўнай пазнавальнай дзейнасці, да актыўнага засваення зместу адукацыі [3, с. 259].

Вядучая ідэя майго вопыту заключаецца ў стварэнні на кожным уроку ўмоў для фарміравання ўстойлівай, станоўчай матывацыі навучэнцаў праз выкарыстанне інтэрактыўных метадаў і прыёмаў навучання.

**2.2. Апісанне сутнасці вопыту**

Праведзены мной аналіз даследаванняў па праблеме выкарыстання інтэрактыўных метадаў навучання паказвае, што большасць з іх абапіраюцца на ідэі тэорыі сімвалічнага інтэракцыянізму Дж. Міда (ЗША), Г. Блумера (ЗША), Ч. Кулі (ЗША) і інш., якія служаць навуковай базай і асновай для распрацоўкі ўмоў, якія садзейнічаюць працэсу самарэалізацыі ў вучэбнай дзейнасці. У айчыннай педагогіцы вялікі ўклад у даследаванне дадзенай тэмы ўнеслі С.С. Кашлеў, а таксама І.І. Казімірская, А.П. Мажар, А.П. Панфілава, А.І. Жук і многія іншыя. У сучаснай педагогіцы гэта методыка абмяркоўваецца ў работах І.А.Буценка, Ю.Г.Адэгава, А.І.Сідарэнка, Ю.П. Сурміна, Г.С. Харханавай, В.С.Чувакінай і інш.

Існуе шмат тлумачэнняў паняцця “інтэрактыўныя метады і прыёмы”. Сэнс інтэрактыўнасці складаецца з абагульнення паняццяў “інтэр” (паміж) і “актыўнасць” (узмоцненая дзейнасць). У гэтай сувязі тэрмін “інтэрактыўнае ўзаемадзеянне” можна тлумачыць як узмоцненую дзейнасць удзельнікаў па ўзаемадзеянні паміж сабой, а тэрмін “інтэрактыўнае педагагічнае ўзаемадзеянне” – як узмоцненую мэтанакіраваную дзейнасць педагога і навучэнцаў па арганізацыі ўзаемадзеяння паміж сабой з мэтай развіцця [6, с. 7].

Дзеянні чалавека зыходзяць з пэўных матываў і накіраваны на пэўныя мэты. Не ведаючы матываў, нельга зразумець, чаму чалавек імкнецца да адной, а не да іншай мэты. Матыў (ад лацінскага movere – прыводзіць у рух, штурхаць) – прычына, падстава для якога-небудзь дзеяння. Матывацыя – сукупнасць матываў, якія пабуджаюць да дасягнення мэт. Асноўнымі матывамі любой дзейнасці з’яўляюцца патрэбы і інтарэсы, пабуджальныя матывы.

Для таго, каб у вучня было жаданне вучыцца, ён павінен адчуваць неабходнасць у ведах і цікавасць да іх. Стымуламі да з'яўлення матываў нярэдка выступаюць знешнія дзеянні ці прычыны. Пабуджальныя матывы залежаць ад асобы і дзейнасці настаўніка, адабранага ім матэрыялу і метадаў яго выкладання вучням. Матывацыя прадугледжвае міжвольную ўвагу і грунтуецца на станоўчых эмоцыях, якія выклікае настаўнік у сваіх выхаванцаў. У шэрагу падобных матываў можна назваць: сімпатыю ці любоў да настаўніка, нагляднасць, тэхнічныя сродкі, цікавае вядзенне настаўнікам урокаў, а менавіта выкарыстанне ім інтэрактыўных метадаў і прыёмаў [2, с. 3-4].

Любая работа абапіраецца на пэўныя прынцыпы. У аснове пазнавальнай актыўнасці прынцып займальнасці – на першым месцы. Акрамя таго, задзейнічаны прынцыпы добраахвотнага і раўнапраўнага ўдзелу вучняў, камунікатыўнай накіраванасці, прынцып самадзейнасці, так як школьнікам часта прыходзіцца праяўляць творчую ініцыятыву.

Як павысіць вучэбную матывацыю вучняў пры вывучэнні беларускай мовы? Працуючы некалькі гадоў над вырашэннем гэтай праблемы, прыйшла да высновы, што інтэрактыўныя метады і прыёмы дапамагаюць больш глыбокаму і якаснаму засваенню матэрыялу, садзейнічаюць развіццю і ўдасканаленню пісьменнасці вучняў, іх камунікатыўнай культуры, індывідуалізацыі, самарэалізацыі вучняў. “Кожнае дзіця становіцца паспяховым, а гэта ў сваю чаргу спрыяе павышэнню станоўчай матывацыі да вывучэння прадмета” [4, с. 12].

На розных этапах урока ў залежнасці ад вырашаемых праблем прымяняю свае інтэрактыўныя метады і прыёмы.

На арганізацыйным этапе ўрока, каб абудзіць у вучняў матывацыю да навучання і працы, падтрымаць яе, стварыць спрыяльную псіхаэмацыянальную атмасферу, скарыстоўваю метадычныя прыёмы “Усміхніцеся, калі…”, “Прагноз надвор'я ў класе”, “Эстафета шчырых слоў”,

“Чароўная кветка пажаданняў”, “Ласкавае імя”, “Алітарацыя імя”, “Дабрыня ў далонях”, “Эстафета добрых слоў” (Дадатак 1).

Названыя метадычныя прыемы спрыяюць стварэнню добрага настрою, стымулююць пазнавальную падрыхтаванасць вучняў да працы на ўроку, настройваюць на камунікатыўнае і інтэрактыўнае ўзаемадзеянне.

На арыентацыйна-матывацыйным этапе часта звяртаюся да эпіграфа (прыём “Жамчужына думкі”). Спачатку з вучнямі вызначаем сэнс радкоў, а потым праводзім арфаграфічную працу паводле тэксту эпіграфа (Дадатак 2).

Метадам “Паветраныя шары” карыстаюся для фармулявання тэмы ўрока самімі вучнямі. На дошцы злева запісваю словы з прапушчанымі арфаграмамі, а справа – рознакаляровыя шары з напісанымі літарамі (неабходна знайсці патрэбны шар і замацаваць на слове). Атрымаецца слова “правапіс” (Дадатак 2). Падабаецца навучэнцам метад “Асенні сад”, калі свае чаканні ад урока яны запісваюць на зяленых лістках, а засцярогі – на жоўтых. У канцы ўрока раблю высновы наконт чаканняў і засцярог (зяленае дрэва – мэты дасягнуты; жоўтае дрэва – вырасла не тое, што чакалі). На пачатку ўрока актывізую вучэбную матывацыю праз такі прыём мэтавызначэння, як “Воблака слоў” (пры вывучэнні тэмы “Ужыванне фразеалагізмаў” у V класе дзеці фармулююць мэты самастойна, карыстаючыся “Воблакам слоў”.) (Дадатак 2).

Для актуалізацыі раней набытых ведаў выкарыстоўваю такія прыёмы, як “Арфаграфічнае лата”, “Чароўны мяшочак”, “Ты – мне, я – табе”, “Кветка дапытлівых” (Дадатак 2). Для ўзнаўлення раней набытых ведаў звяртаюся да метаду “Апрані фразу”, калі вучні запісваюць на паперы пачатак фразы (ці друкую сама), якую неабходна завяршыць. Навучэнцы індывідуальна заканчваюць фразу, занатоўваюць на паперы. Праз тры хвіліны я збіраю з напісанымі фразамі і прапаноўваю двум-тром вучням выканаць ролю экспертнай групы і правесці праверку адказаў, зрабіць падагульненне. Затым падсумоўваю вынікі (Дадатак 2). Стымулююць мысліцельную дзейнасць і падштурхоўваюць да вырашэння ўзнікшай праблемы метадычныя прыёмы “Здзіўляй” (пры вывучэнні тэмы “Правапіс прыстаўных зычных” у V класе);

“Адтэрмінаваная адгадка” (на тэму “Правапіс складаных назоўнікаў” у VI класе), калі прапаноўваюю вучням загадку, адгадка якой стане вядомай у ходзе працы над новым матэрыялам (Дадатак 2). Дапамагаюць навучэнцам аперaтыўна ўключыцца ў працу такія метады, як “Гіпотэзы”, “Кошык ідэй”. Па тэме “Двухсастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне” ў VIII класе даю заданне ўзгадаць памятку, якой мы карыстаемся пры вызначэнні віду даданага члена сказа. Вучні прапаноўваць магчымыя рашэнні і выбіраюць лепшыя з іх, каб потым разабрацца ў сутнасці праблемы. *А. Знайсці слова, ад якога член сказа залежыць; Б. Высветліць, што ён абазначае. В. На якое пытанне адказвае; Г. Якой часцінай мовы выражаны.* Прымаю любыя адказы на пастаўленае пытанне, галоўнае – не даю ацэнку выказанаму адразу, а запісваю думкі кожнага на дошцы.

Пералічаныя інтэрактыўныя метады і прыёмы дапамагаюць вучням усвядоміць мэту ўрока праз пытанні і заданні, а настаўніку – сканцэнтраваць увагу на вывучэнні тэмы ці пэўнага матэрыялу, стварыць сітуацыю поспеху.

На аперацыйна-пазнавальным этапе вучні засвойваюць новае, атрымоўваюць неабходныя веды, пры гэтым вырашаюцца асноўныя задачы ўрока. На гэтым этапе аддаю перавагу групавой форме навучання, паколькі ўпэўнілася, што больш актыўным і крэатыўным вучань робіцца тады, калі працуе ў камандзе. У сувязі з гэтым імкнуся выпрацоўваць у навучэнцаў уменне камунікаваць, дамаўляцца, канструктыўна супрацоўнічаць. Для гэтага абавязкова знаёмлю вучняў з асноўнымі этыкетнымі правіламі: 1. У час гутаркі глядзі на суразмоўцу; 2. Гавары ў пары ціха, каб не перашкаджаць іншым; 3. Называй таго, з кім гаворыш, па імені, уважліва слухай адказ.

Для вывучэння новай тэмы або падагульнення і сістэматызацыі вывучанага часта карыстаюся такімі метадамі, як “Інфа-ўгадайка”, “Дрэва рашэнняў”, бо вучні камунікуюць з іншымі вучнямі, уключаюцца ў сумесную пошукава-эўрыстычную і пазнавальную дзейнасць. Пры абагульненні ведаў па тэме “Прыслоўе” VII клас падзяліла на групы (1 група - сэнсавыя разрады прыслоўяў, 2 група – формы ступеней параўнання прыслоўяў, сінтаксічная

роля, 3 група – правапіс прыслоўяў, 4 група – спосабы ўтварэння прыслоўяў), якія абмяркоўвалі пытанне па тэме і рабілі запісы на сваім дрэве (аркуш ватману), а потым групы мяняліся месцамі і дапаўнялі адказы на дрэвах “суседзяў”. Пасля ў групах адбыўся абмен і ўзаемаправерка выкананых заданняў.

Сучасны ўрок не бачу без такога метаду, як “Аўтобусны прыпынак”. Пры падагульненні і сістэматызацыі вывучанага па тэме “Назоўнік” прапаноўваю вучням павандраваць, размярокоўваю іх па аўтобусных прыпынках, на якіх ляжаць аркушы паперы з запісанымі пытаннямі. Вучні занатоўваюць асноўныя моманты па вывучанай тэме, адказваючы на пытанні. Затым групы пераходзяць да наступнага прыпынку. Знаёмяцца з запісамі папярэдняй групы і пры неабходнасці дапаўняюць іх. Выпраўляць напісанае нельга. Калі група вяртаецца да свайго прыпынку, яна знаёміцца з усімі запісамі і прэзентуе вынікі напрацовак па сваім пытанні (Дадатак 2).

Для рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу на вучэбным занятку часта прымяняю прыёмы “Аратар” (За адну хвіліну патрэбна пераканаць суразмоўцу ў неабходнасці вывучэння тэмы “Лічэбнік” у VI класе: “Дакажыце з пазіцыі чалавека той прафесіі, якую б вы выбралі”), “Аўтар” (Калі б вы былі аўтарам падручніка, як вы патлумачылі б вучням VI класа тэму “Назоўнікі адушаўлёныя і неадушаўлёныя”, а калі б былі мастаком-ілюстратарам, як вы праілюстравалі б яе).

Гэтыя метады развіваюць інтэлектуальна-пазнавальныя здольнасці, мадэлюючае і творчае мысленне вучняў.

На трэніровачна-карэкцыйным этапе асноўную ўвагу засяроджваю на адпрацоўцы і замацаванні атрыманых ведаў праз сістэму практыкаванняў і заданняў. Каб было паспяховае засваенне матэрыялу, вучэбна-трэніровачная работа на маіх уроках пастаянная, паслядоўная, а садзейнічаюць гэтаму такі прыём, як “Злаві памылку” на ўроку ў VI класе па тэме “Прыметнікі з суфіксам -ск-, іх правапіс”. Ён актывізуе ўвагу вучняў, дапамагае фарміраваць уменне аналізаваць інфармацыю, прымяняць веды ў нестандартнай сітуацыі. У V класе

на ўроку падагульнення і сістэматызацыі ведаў па арфаграфіі прымяняю метадычны прыём “Адгадай слова”. “Адным словам” – гэты прыём скарыстоўваю пры вывучэнні тэмы “Правапіс не (ня) з назоўнікамі”. Падобны да папярэдняга метадычны прыем “Пазнай слова па лексічным значэнні”. Яго назва гаворыць сама за сябе (Дадатак 3).

На этапе засваення новых ведаў прыдатны прыёмы “Ствары пашпарт”, “Навучаючы – вучуся”, “Аўкцыён ведаў” (Прымаюць удзел 4 каманды V класа: дзве гуляюць, дзве – заўзятары, потым мяняюцца месцамі; на “продаж” выстаўляецца лот – “Правапіс у, ў”, займець які можна, толькі дэманструючы добрае веданне матэрыялу па тэме лота.), “Веды з мяшка” (у невялікі палатняны мех кладу надрукаваныя заданні ці пытанні па новай тэме). У V класе прыём “Арфаграфічны футбол”, калі вучні размяркоўваюць словы ў два слупкі: “Фанетычнае падаўжэнне” і “Марфалагічнае падваенне”, спрыяе замацаванню атрыманых ведаў і карэкцыі памылак па тэме “Правапіс падоўжаных зычных”.

З дапамогай гэтых метадычных прыёмаў імкнуся развіваць аналітычныя ўменні навучэнцаў, іх моўную чуйнасць, арфаграфічную пільнасць, здольнасць усвядомлена прымяняць правілы.

На розных этапах урока карыстаюся яшчэ такім сэрвісам, як LearningApps.org – канструктар электронных інтэрактыўных практыкаванняў, які дазваляе стварыць дыдактычныя матэрыялы і інструменты для самаправеркі і самаацэнкі. Гэтыя заданні я распрацоўваю сама, а потым вучні на ўроку могуць праверыць і замацаваць свае веды ў гульнявой форме, што спрыяе фарміраванню іх пазнавальнай цікавасці да беларускай мовы (https://learningapps.org/user/Новик Елена).

Вядома, што кантрольна-ацэначная дзейнасць “служыць моцным матывацыйным фактарам: вучань радуецца сваім поспехам і бачыць, над чым яму яшчэ трэба папрацаваць” [2, с. 5]. Пасля выканання выніковага задання ён мае магчымасць вызначыць узровень засваення матэрыялу і ступень дасягнення задач, пастаўленых на пачатку ўрока. На кантрольна-ацэначным

этапе аддаю перавагу наступным метадам і прыёмам: інтэрактыўны тэст “Малайцы”, “Тэст-лато”, метад “Ключавое слова” (маецца на ўвазе тэма ўрока). Вучні працуюць у парах або індывідуальна, ім прапануеццца падабраць хаця б па адным прыкладзе на кожную літару на пэўнае правіла. Напрыклад, “Падаўжэнне зычных”, V клас. Метад “Атрымай дзявятку” прымяняю ў VI класе пры вывучэнні тэмы “Правапіс складаных прыметнікаў” (Дадатак 3).

Немалаважную ролю, на маю думку, выконвае на ўроку рэфлексія, праз якую вучні ўсведамляюць крыніцу цяжкасцей, з якімі прыйшлося сутыкнуцца на ўроку, сферу сваіх пазнавальных інтарэсаў. На гэтым этапе часта карыстаюся прыёмамі “Завяршы фразу”, “Тэлеграма” або “SMS настаўніку”, “Рукзак”. Не пакідаюць раўнадушнымі вучняў такія метады і прыёмы рэфлексіі, як “Асацыяцыі”, “Зярняткі ведаў”, “Воблака слоў”. Прыём “Чыстая дошка” дазваляе засведчыць, што запланаваны і пройдзены матэрыял засвоены, бо на дошцы на пачатку ўрока запісваю паняцці па новай тэме, а ў яго канцы патлумачанае і засвоенае паняцце выціраю (Дадатак 4).

Прэзентаваныя інтэрактыўныя метады дапамогуць заахвоціць навучэнцаў працаваць без прымусу, а гэта будзе садзейнічаць павышэнню якасці арфаграфічнай пісьменнасці. Галоўнае – з’яўляецца станоўчая матывацыя да навучання, стымулюецца актыўная вучэбна-пазнавальная дзейнасць, мабілізуецца іх творчы патэнцыял.

Такім чынам, прымяненне інтэрактыўных метадаў і прыёмаў забяспечвае ўзмацненне матывацыі, развіццё камунікатыўных навыкаў, стварае эмацыйна камфортнае становішча неабходнае для павышэння пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў.

### 2.3. Выніковасць і эфектыўнасць вопыту

Для вывучэння эфектыўнасці і выніковасці выкарыстання свайго вопыту прымяняўся наступны дыягнастычны інструментар: дыягностыка ўзроўню развіцця матывацыі вучэбнай дзейнасці вучняў па методыцы Л.М. Фрыдмана (Дадатак 6).

Табліца 1. Узровень развіцця матывацыі вучэбнай дзейнасці вучняў

| Вучэбны год | Класы | Узровень матывацыі, % | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Высокі | Сярэдні | Нізкі |
| 2018/2019 | 5 | 32% | 40% | 28% |
| 2019/2020 | 6 | 38% | 37% | 25% |
| 2020/2021 | 7 | 46% | 33% | 21% |

Вынікі дыягностыкі паказваюць рост узроўню сфарміраванасці вучэбнай матывацыі да вывучэння беларускай мовы за разгледжаны перыяд.

Ускосным доказам эфектыўнасці выкарыстання інтэрактыўных метадаў і прыёмаў навучання з'яўляецца рост узроўню якасці ведаў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» за аналізуемы перыяд.

Табліца 2. Вынікі вучэбнай дзейнасці вучняў па беларускай мове

| Клас | Вучэбны год | Сярэдні бал | Узровень якасці ведаў (на «6» - «10» балаў), % |
|---|---|---|---|
| 5 | 2018/2019 | 6,3 | 65,3% |
| 6 | 2019/2020 | 6,5 | 76,4% |
| 7 | 2020/2021 | 6,7 | 83% |

Вынікі праведзеных мною даследаванняў сведчаць аб высокім узроўні матывацыі вучэбных дасягненняў, павышэнні якасці ведаў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова».

## *3 Заключэнне*

### 3.1. Вывады і прапановы

Выкарыстанне ў маёй педагагічнай дзейнасці прадстаўленага вопыту дазваляе павысіць матывацыю да прадмета, што, безумоўна, заахвочвае дзяцей да адпаведнай дзейнасці з мэтай свядомага пашырэння і паглыблення сваіх ведаў, павышэння свайго культурнага ўзроўню. Фарміраванне моўнай кампетэнцыі адбываецца не праз запамінанне правіла, прад’яўленага ў гатовым выглядзе, а праз актуалізацыю дзейнасці. У павышэнні матывацыі вялікая роля належыць элементам займальнасці, прэзентацыі лінгвістычных тэрмінаў,

сумеснаму высвятленню семантыкі слова ў працэсе суразмоўніцтва. Так вучні лягчэй засвойваюць матэрыял.

Такім чынам, выкарыстанне метадаў і прыёмаў, якія павышаюць вучэбную матывацыю, дазваляе зрабіць наступныя высновы: а) усе вучні ўключаюцца ў працэс авалодання ведамі на максімальным для кожнага з іх узроўні; б) адбываецца стымуляванне развіцця мысліцельнай і творчай актыўнасці вучняў; в) удасканальваецца сацыяльны вопыт вучняў, фарміруецца жыццёвая пазіцыя, каштоўнасці.

**3.2. Перспектыва ўдасканалення дадзенага вопыту і сваёй прафесійнай практыкі**

Работа над дадзенай тэмай працягваецца. Удасканальваюцца метады і прыёмы па развіцці пазнавальнай актыўнасці вучняў. Вынікам сваёй работы бачу павышэнне матывацыі да навучання і якасці ведаў у яшчэ большай колькасці вучняў.

**3.3. Даступнасць і формы распаўсюджвання вопыту**

Характэрнымі рысамі прапанаванага вопыту з’яўляецца структураванасць і практычная накіраванасць, дзякуючы чаму ён можа быць выкарыстаны настаўнікамі, адаптаваны і адноўлены ва ўмовах любой навучальнай установы падчас правядзення ўрокаў па беларускай мове, у межах абмену вопытам з настаўнікамі школы і раёна.

**3.4. Выступленні з дадзеным вопытам у педагагічных аўдыторыях**

Вопыт працы па дадзенай тэме быў прадстаўлены на пасяджэнні школьнага метадычнага аб'яднання. Мною былі праведзены адкрытыя вучэбныя заняткі (Дадатак 5), майстар-клас для педагогаў ДУА “Маладзечанская сярэдняя школа №1 імя Янкі Купалы”. Вопыт працы па дадзенай тэме быў прадстаўлены на старонках часопіса “Народная асвета” (№ 4, 2021). Практычнае выкарыстанне метадаў, прыёмаў па развіцці пазнавальнай актыўнасці вучняў было прадэманстравана на школьным пастаянна дзеючым семінары (выступленне “Матывацыя на ўроках беларускай

мовы і літаратуры”), на педагагічным савеце (выступленне на тэму “Як развіць пазнавальную актыўнасць у дзяцей”).

Лічу, што мой педагагічны вопыт карысны для тых настаўнікаў, якія жадаюць працаваць творча, знаходзяцца ў пастаянным пошуку спосабаў зрабіць урок цікавым і дапамагчы вучням палюбіць школу як месца, дзе ён не зубрыць, а адкрывае для сябе складаны свет.

**3.5. Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Адукацыйныя стандарты агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджаныя пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 26.12.2018 № 125 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf – Дата доступу : 10.09.2019.

2. Жуковіч, М. В. Фарміраванне ў школьнікаў матывацыі да навучання на ўроках беларускай мовы і літаратуры / М. В. Жуковіч // Беларус. мова і літ. – 2004. – С. 3–5

3. Ильин, Е. П. Мотивация и мотивы / Е. П. Ильин.– СПб.: Питер, 2011. – 512 с.

4. Кашлев, С. С. Интерактивные методы обучения педагогике: учеб. пособие / С. С. Кашлев. — Минск: Выш. шк., 2004. —176 с.

5. Кодекс Республики Беларусь об образовании: с изм. и доп. по состоянию на 12 марта 2012 г. – Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2012. – 400 с.

6. Макавецкая, К. З. Выкарыстанне інтэрактыўных метадаў і прыемаў пры выкладанні беларускай мовы і літаратуры / К. З. Макавецкая // Беларус. мова і літ. – 2016. – № 5. – С. 7 – 12.

Дадатак 1

**Вучэбны прадмет «Беларуская мова»**

**Фрагменты ўрокаў з выкарыстаннем інтэрактыўных метадаў і прыёмаў на арганізацыйным этапе ўрока**

1. **“І гэта добра!”.** Паглядзіце ў акенца! На вуліцы вясна. Які настрой выклікае вясна? Побач з вамі – сябры, якія заўсёды прыйдуць на дапамогу! Паглядзіце адзін на аднаго, усміхніцеся. Як вы будзеце працаваць? (Добра!) Разгарніце вучэбныя дапаможнікі. Вы заўседы можаце да іх звярнуцца (“І гэта добра!”).

2. **“Эстафета шчырых слоў”, “Чароўная кветка пажаданняў”, “Ласкавае імя”, “Алітарацыя імя”**. Вучні па ланцужку звяртаюцца са шчырымі і добрымі словамі адзін да аднаго, падбіраюць ласкавыя словы да іменаў або выказваюць пажаданні на ўрок. Заканчвае ланцужок слоў-пажаданняў настаўнік:

Хай будзе светлы ваш узлет,
Да новых спраў, сябры!
Няхай прыносіць вам урок
Найлепшыя дары!
(Анатоль Грачанікаў)

3. **“Прыказка або фразеалагізм у дарогу”**

Растлумачце прыказкі, фразеалагізмы. Якія з іх возьмеце з сабою на ўрок? Чаму?

Што пасееш, тое і вырасце.

Што робіцца наспех, тое выходзіць курам на смех.

Шчасце адчуеш, калі папрацуеш

Як мыш пад венікам.

Падстаўлю плячо.

Сам не свой.

Трымаць вуха востра.

Мая хата з краю, нічога не знаю.

Дадатак 2

**Вучэбны прадмет «Беларуская мова»**

**Фрагменты ўрокаў з выкарыстаннем інтэрактыўных метадаў і прыёмаў на арыентацыйна-матывацыйным і пазнавальна-аперацыйным этапах урока**

1. **“Жамчужына думкі”** (зварот да эпіграфа). Тэма “Правапіс не (ня) з прыметнікамі, VI клас.

Слова! Цуд найвялікшы між цудаў-дзівосаў,

Што здзіўляе ў вяках і здзіўляе нанова.

Трапяткое, жывое, як сонца ў росах,

**Несмяротнае**, роднае матчына слова.

(Ніл Гілевіч)

– Пра якое слова гаворыць паэт? Як ен яго характарызуе? Чаму слова “несмяротнае” пішацца разам? Якая тэма сенняшняга ўрока?

2. **“Здзіўляй”.** Тэма “Правапіс прыстаўных зычных”, V клас:

Сасоннік. Сасняк. Сасновы бор… Прадоўжыць сінонімаў падбор?

**Альхоўнік. Вольха.** Алешнік. Альха… Бедная мова наша? Га?

(Анатоль Вярцінскі)

- Чаму ў словах “альхоўнік”, “альха” пішацца літара *а,* а ў слове “вольха” – *в*?

3. **“Адтэрмінаваная адгадка”**. Тэма “Правапіс складаных назоўнікаў”, VI клас. Заданне. Адгадайце загадку Ніны Галіноўскай.

Выходзяць віцязі марскія. І ўсе прыгожыя такія.

Іх царства – казачнае мора з гасцінным дзядзькам … (Чарнаморам.)

- Чаму слова “Чарнамор” пішацца разам? Чаму ў першай частцы слова пішацца літара *а* ?

4. **“Чыстая дошка”.** Тэма “Агульна-ўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку”, V клас.

На дошцы ў выглядзе аблачынак заданні па тэме “Лексіка”. Два вучні выходзяць да дошкі, выбіраюць заданні, са зваротнага боку чытаюць умову,

агучваюць адказ. Пытанні: – Што такое лексіка? – Што з'яўляецца лексічным значэннем слова? – Дзе раскрываецца лексічнае значэнне слова? – Якія словы называюцца агульнаўжывальнымі? – Словы абмежаванага ўжытку – гэта словы … - Якія словы адносяцца да прафесійных? - Фуганак, гэбель, райсшына – гэта …словы. – Выказнік, назоўнік, суфікс – гэта…

**5. "Кветка дапытлівых", ("Рамонак для цікаўных").** Тэма "Сказы з адасобленымі дапаўненнямі, іх інтанаванне, знакі прыпынку", VIII клас. На пялёстках кветкі напісаны пытанні, вучні па чарзе ці па жаданні адрываюць пялёсткі і адказваюють на пытанні па вывучанай тэме.

1. Што называецца адасабленнем? 2. Якія члены сказа могуць адасабляцца? 3. Якія знакі прыпынку ўжываюцца для выдзялення адасобленых членаў сказа на пісьме? 4. Якія азначэнні называюцца дапасаванымі, а якія недапасаванымі? 5. Пры якой умове азначэнні (дапасаваныя і недапасаваныя) адасабляюцца незалежна ад месца ў сказе? 6. Калі адасобленыя прыдаткі на пісьме выдзяляюцца працяжнікамі?

**8. "Апрані фразу"**.

Тэма "Назоўнік як часціна мовы : агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма", VI клас.

Сёння мы працягваем падарожжа па краіне "Мовазнаўства" і накіроўваемся ў казачны горад "Марфалогія", дзеясловы засталіся без вопраткі і іх трэба апрануць. 1. Марфалогія вывучае… 2. У гэтым казачным горадзе жыве … часцін мовы. 3. Усе часціны мовы падзяляюцца на дзве групы… 4. Да самастойных часцін мовы належаць…, а да службовых… 5. Мы не назвалі часціну мовы…, бо … 6. Выклічнікі служаць для … 7. Самастойныя часціны мовы адрозніваюцца ад службовых…

**9. "Паветраныя шары"** Тэма "Правапіс не (ня) з рознымі часцінамі мовы", VII клас.

*Нясцер…ны боль, неміласэ…ныя словы, незм…ўкальны шум, хлопец неда…учка, нямож…цца, далека не ле…ш, незл…чоныя багацці, далека не блі…кучы адказ.* Атрымаецца слова "правапіс".

**10. “Воблака слоў”.** Тэма “Ужыванне фразеалагізмаў”, V клас.




**11. “Аўтобусны прыпынак”.** Тэма “Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме “Назоўнік”, VI клас.

– На вуліцы зіма. Лётаюць сняжынкі. Яны прыляцелі на мой стол і на дошку. Капітаны каманд выберыце сабе заданне ў чароўным куфэрачку. Пра выкананне задання каманды паведамляюць з дапамогай сняжынак.

1 група - застанецца на прыпынку “Галоўны праспект” і будзе працаваць з адушаўлёнымі і неадушаўлёнымі назоўнікамі;

2 група – адправіцца на прыпынак “Агульныя і ўласныя назоўнікі”;

3 група – спыніцца на прыпынку “Рэчыўныя і зборныя назоўнікі”;

4 група – наведае прыпынак “Канкрэтныя і абстрактныя назоўнікі”.

**12. “Злаві памылку”** Тэма “Прыметнікі з суфіксам -ск-, іх правапіс”, VI клас.

*Беларуская мова, гарацкі транспарт, ліпенскі дзень, Белавежская пушча, палеская рака, Брэстская крэпасць, турэкскі фільм.*

Дадатак 3

**Вучэбны прадмет «Беларуская мова»**

**Фрагменты ўрокаў з выкарыстаннем інтэрактыўных метадаў і прыёмаў на трэніровачна-карэкцыйным і кантрольна-ацэначным этапах**

1. **“Адгадай слова”.** Тэма “Падагульненне па арфаграфіі”, V клас

**Заданне.** З прапушчаных літар складзіце слова.

*А…капаць (б), аранж..рэя (а), бара…ьбіт (ц), піс..меннік (ь), ва…зал (к), д…лікатэс (а), тра…ма (ў), ні…чымніца (ш), на рэ..цы (ч), кр…вавы (ы), ван…а (н), камп’ют…р (а).* ***(Бацькаўшчына.)***

2. **“Адным словам”**. Тэма “Правапіс не (ня) з назоўнікамі”, VI клас.

**Заданне.** Замяніце адным словам.

1. Дзіця, якое яшчэ не размаўляе, называюць… (немаўля).
2. Таго, каму не сядзіцца на месцы, называюць… (непаседа).
3. Таго, хто не завяршыў адукацыю, вучобу, называюць … (недавук).
4. Таго, каго не ведаюць, з кім незнаемы, называюць … (незнаемец).
5. Зацяжную непагоду называюць … (непагадзь).
6. Вечнае існаванне, несмяротнасць называюць … (неўміручасць).

3. **“Пазнай слова па лексічным значэнні”.** Тэма “Лексічнае значэнне слова”, V клас (аднчасова праводзіцца паўтарэнне правапісу некаторых спалучэнняў зычных).

1. Схільнасць да спагады іншым, да літасці над кім-небудзь. (Міласэрнасць.)
2. Цела, якое з’яўляецца вогненным шарам і вылучае святло і цяпло. (Сонца.)
3. Які мае адносіны да вобласці, належыць ей. (Абласны.)
4. Той, якому дадзена шчасце. (Шчаслівы.)
5. Ежа без мяса, якую ўжываюць у час посту. (Посная).

4. **Інтэрактыўны тэст “Малайцы”.** Тэма “Правапіс не (ня), ні з дзеясловамі, VII клас.

**Заданне.** Выберыце правільныя выказванні. Выпішыце літары, якія стаяць на пачатку гэтых сказаў.

**М)** *Не* з дзеясловамі амаль заўседы пішацца асобна.

Д) *Не* з дзеясловамі ніколі не пішацца разам.

**А)** *Ні з* дзеясловамі пішацца асобна.

К) Прыказка напісана правільна: *Дурная птушка свайго гнязда нешануе.*

Е) Дзеяслоў *недаглядзець (фільм*) напісаны правільна.

**Л)** Слова *непакоіць* без *не* не ўжываецца.

**А)** Слова *не мог* вымаўляецца так: [н' а мох].

З) Слова *неразумны* – гэта дзеяслоў.

**Й)** У сказе няма памылак: *Не бярыся за тое, што не можаш зрабіць.*

**Ц)** Прыстаўка *–неда-* пішацца з дзеясловамі разам, калі абазначае неадпаведнасць дзеяння патрэбнай норме.

**Ы)** У сказе не (ня) з дзеясловамі трэба пісаць разам. *Ці ж я цябе (не, ня) волю?*

Адказ: “малайцы”.

**5. “Ключавое слова”** (маецца на ўвазе тэма ўрока). Вучні працуюць у парах або індывідуальна, ім прапануеццца падабраць хаця б па адным прыкладзе на кожную літару на пэўнае правіла. Напрыклад, “Падаўжэнне зычных” (V клас).

**П** – падарожжа;

**А** – Аксіння;

**Д** – двукоссе;

**А** – асяроддзе;

**Ў** – узлессе;

**Ж** – Жанна;

**Э** – эскадрылля;

**Н** – насенне;

**Н** – наваколле;

**Е** – Евангелле.

**6. “Атрымай дзявятку”**. Тэма “Правапіс складаных прыметнікаў”, VI клас.

**Заданне.** Падкрэсліце прыметнікі, якія пішуцца разам, пазначце нумары правільных адказаў у суадносных клетках зорачкамі і злучыце іх.

1) Залаціста (ружовы);
2) Інша (моўны);
3) Бела (грывы);
4) Паўночна (заходні);
5) Блакітна (вокі);
6) Руса (валосы);
7) Горка (салены);
8) Шахматна (шашачны);
9) Вечна (зялены);
10) Руска (беларускі);
11) Сарака (тонны);
12) Заходне (беларускі).

У таго, хто справіўся з заданнем, павінна атрымацца “9”

| | | |
|---|---|---|
| 1 | * 2 | * 3 |
| 4 | * 5 | * 6 |
| 7 | 8 | * 9 |
| 10 | * 11 | * 12 |

*7.* **“Злаві памылку**”

О Беларусь ( ж.р.,адз.лік, Н.скл., дзейнік), мая калыска (ж.р.,адз. лік, В.скл.), жыццё (н.р., мн.л.,Р.скл.) маё, прытулак (н.р.,адз.л.,Н.скл,) мой! З гарачаю любоўю ( ж.р., адз.лік, М.скл., дапаўненне) нізка схіляюся перад табой.

П. Панчанка

1) Ці правільна вызначаны марфалагічныя прыметы назоўніка і іх сінтаксічная роля? Выпраўце памылкі. 2) Чым з’яўляецца Беларусь для Пімена Панчанкі?

3) Растлумачце значэнне слова *прытулак (Прытулак – месца, дзе можна ўратавацца ад каго-небудзь, чаго-небудзь, адпачыць, прабыць патрэбны час.)*

4) Як вы разумееце, што Беларусь – для аўтара прытулак?

**8. “Веру – не веру”.** Тэма “Прыслоўе”, VII клас.

1. Прыслоўе – гэта службовая часціна мовы, якая абазначае прымету дзеяння і адказвае на пытанні *ЯК? ДЗЕ? КУДЫ? АДКУЛЬ?* (Не веру, …)
2. Прыслоўе – самастойная часціна мовы, якая абазначае прымету дзеяння або прымету іншай прыметы ці прадмета і адказвае на пытанні *ЯК? ЯКІМ ЧЫНАМ? КАЛІ? ДЗЕ? КУДЫ?* (Веру, …)
3. Прыслоўі змяняюцца па склонах, асобах і ліках. (Не веру, …)
4. Прыслоўі не скланяюцца, не спрагаюцца, не маюць роду і ліку. (Веру, …)
5. Маюць на канцы толькі суфіксы. (Веру, …)
6. Могуць мець на канцы суфіксы і канчаткі. (Не веру, …)
7. У сказе прыслоўе найчасцей бывае акалічнасцю. (Веру, …)

**Тэма “Назоўнік”, VI клас.**

1. Назоўнік – часціна мовы, якая абазначае прадмет? (Веру,…). 2. Назоўнік адказвае на пытанні ЯКІ? ЯКАЯ? ЯКОЕ? (Не веру,…). 3. Назоўнік мае 8 склонаў? (Не веру,…). 4. Назоўнікі бываюць 1, 2, 3, 4 скланення? (Не веру,…). 5. Усе назоўнікі могуць ужывацца толькі ў адзіночным ліку? (Не веру,…). 6. Склонавыя канчаткі назоўнікаў залежаць ад апошняга зычнага асновы? (Веру,…).

Дадатак 4

**Вучэбны прадмет “Беларуская мова”**

**Фрагменты ўрокаў з выкарыстаннем інтэрактыўных метадаў і прыёмаў на этапе рэфлексіі**

1. **“Асацыяцыі”.** На дошцы запісаны асацыяцыі:

Па хвалях пад ветразем – хутка і лёгка, нават занадта лёгка;

Лясная дарога – за кожным паваротам адкрываецца нешта новае;

Штурм горнай вяршыні – цяжка, але цікава;

Балота – непрыемна брысці па балоце;

Пустыня – кожны ўрок адно і тое ж.

Вучні пры выхадзе з класа прымацоўваюцьстыкер каля пэўнага надпісу.

2. **“Ланцужок пажаданняў і камплiментаў”** Вучні звяртаюцца з кампліментамі ці пажаданнямі да сябе і да іншых. Я заканчваю ланцужок пажаданняў.

3. **“Пяць шляхоў”.** У навучэнцаў на сталах ляжаць чыстыя лісты, на якіх яны абводзяць сваю далонь. Кожны палец – гэта пэўны шлях. Па першым шляху ідзе той, у каго не было цяжкасцей на ўроку, па другім – той, хто, пераадолеўшы цяжкасці, змог засвоіць тэму ўрока, па трэцім – той, хто жадае яшчэ дадаткова атрымаць веды, па чацвёртым шляху ідзе той, у каго засталіся пытанні па тэме, а па пятым пойдзе той, хто нічога не зразумеў.

1. **“Калейдаскоп пачуццяў”.** Вучні вызначаюць тыя пачуцці, якія адчулі ў канцы ўрока, і абгрунтоўваюць свой адказ. Яны падымаюць картку з літарай (А, Б, В, Г): А – радасць, натхненне, Б – здзіўленне і задавальненне, В – стомленасць і разгубленасць, Г – ваш варыянт.

2. **“Краявід”.** Прапаноўваю два малюнкі з выявамі краявіду. Адзін – прасякнуты сумным, журботным настроем, другі – радасным, вясёлым. Навучэнцы выбіраюць той, які адпавядае іх настрою.

3. **“Зярняткі ведаў”.** Раздаю карткі, на якіх вучні вызначаюць “стадыю росту” іх “ведаў-зярнятак”: - *ляжу ў глебе,* - *стаў прарастаць,* - *узышоў,* - *вырас,* - *закаласіўся.*

**4. “Далонь”**

А цяпер я хачу вас папрасіць паглядзець на свае далоні. Далонь у нашым жыцці выконвае вялікую ролю: з яе дапамогай мы вітаемся, прадказваем лёс.

**Мезенец** – “думка” : Якія веды, вопыт я сёння атрымаў? **Безыменны** – “ці блізкая мэта?”: Што я сёння зрабіў для дасягнення сваёй мэты? **Сярэдні** – “стан духу” : Якім быў мой настрой? Ад чаго ён залежаў? **Указальны** – “паслуга”: Чым я сёння дапамог іншым людзям, чым парадаваў іх? **Вялікі** – “бадзёрасць цела”: Як я фізічна адчуваў сябе, што зрабіў для свайго здароўя?

Дадатак 5

**Вучэбны прадмет “Беларуская мова”, VII клас**

**Тэма**: **Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме “Дзеяслоў”**

**Мэта**: стварыць умовы для:

- падагульнення, сістэматызацыі ведаў вучняў па тэме “Дзеяслоў”;
- замацаванню ўменняў распазнаваць дзеясловы ў тэксце на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет; вызначаць сэнсава-граматычную і стылістычную ролю дзеясловаў у тэкстах;
- удасканальвання навыкаў правільнага напісання дзеясловаў умоўнага ладу, суфіксаў, асабовых канчаткаў, не (ня) з дзеясловамі; умення правільна ўтвараць і ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні формы ладу і часу дзеясловаў;
- равіцця звязнага маўлення вучняў, памяці, мыслення; умення лагічна, дакладна і паслядоўна фармуляваць свае думкі; культуры зносін у калектыве;
- выхавання пачуцця гонару і любові да роднага краю, павагі і пашаны да беларускага слова.

**Тып урока**: абагульненне і сістэматызацыя ведаў.

**Міжпрадметныя сувязі**: беларуская літаратура.

**Выкарыстаная тэхналогія**: развіцця крытычнага мыслення, ІКТ, метады і прыёмы інтэрактыўнага навучання.

**Абсталяванне**: вучэбны дапаможнік для 6-га класа, інтэрактыўная дошка, прэзентацыя, карткі, заданне леарнінг апс.

**Эпіграф**:

Якія знаёмыя назвы і словы,
Якая цудоўная родная мова!
І ўсё мілагучна для слыху майго:
І звонкае “дзе” і густое “чаго”…
Ці **плачу** я, ці **пяю,**
Ці **размаўляю** з матуляю –

Песню сваю, мову сваю

Я да грудзей **прытульваю**.

Пімен Панчанка

**Ход урока**

**1. Арганізацыйны момант. Падрыхтоўка да ўспрымання.**

**Настаўнік.** Вітаю вас, сябры! Сёння наш урок будзе незвычайным. Паглядзіце ў акно! Што мы бачым? (Нам усміхаецца сонейка, пяшчотна і ласкава дакранаючыся да вашых тварыкаў). Прыём **“Прагноз надвор’я”**. Скажыце з якім настроем прыйшлі сення на ўрок, выкарыстоўваючы тэрміны “сонечнае”, “пахмурнае”, “дажджлівае”, “цёплае”, “ветранае”. Павярніцеся і прывітайцеа адзін аднаго ўсмешкай. Вы здольныя, разумныя, і, вядома ж, у вас усё атрымаецца!

**ІІ. Паведамленне тэмы і мэтавызначэнне.**

1.Выклік. Матывацыя тэмы.

**Настаўнік.** Для таго, каб захаваць працаздольнасць, нам патрэбны добры настрой. Па якіх прыметах можна вызначыць, што чалавек знаходзіцца ў добрым настроі? (Жартуе, усміхаецца, спявае). Словы якой часціны мовы вы назвалі? Ці знаёмае для вас гэтае слова?

**Настаўнік.** Тэма нашага ўрока – “Дзеяслоў”. Запішыце дату і тэму ўрока ў сшыткі. (Дата і класная работа запісаны на дошцы.)

2. Фармулёўка мэт урока вучнямі.

**Настаўнік.** Што неабходна засвоіць на працягу ўрока? (на слайдзе змешчаны ключавыя словы: падагульніць, сістэматызаваць, замацаваць, удасканальваць, развіваць).

(*Слайд з мэтамі ўрока дэманструецца пасля таго, як вучні вызначаць іх самастойна*).

**ІІІ. Актуалізацыя ведаў.**

Настаўнік. Родная мова! Яна ўваходзіць у наша жыццё з вуснаў маці, з матчыных песень, цудоўных беларускіх казак, легенд, паданняў.

Вучань чытае эпіграф да ўрока (запіс на слайдзе).

**Настаўнік.** Якім пачуццём прасякнуты гэтыя радкі? Вызначце асноўную думку верша. Які загаловак вы яму далі б? Чаму? *(Адказы вучняў).*

**Настаўнік.** Я бачу, што вашыя пачуцці сугучныя з пачуццямі аўтара, таму мы можам выкарыстаць гэтыя радкі ў якасці эпіграфа да ўрока. Гэта значыць, што лексічнай тэмай нашага ўрока будзе - “Павага і любоў да роднай мовы”.

**Настаўнік.** Зараз папрацуем над тэкстам эпіграфа. Знайдзіце ў вершы дзеясловы і падкрэсліце на інтэрактыўнай дошцы, запішыце ў свае сшыткі. *(Адказы вучняў).*

- Што такое дзеяслоў? Якая роля дзеяслова ў гэтым вершы? (дзеясловы “плачу”, (фізічны стан), “пяю”, “размаўляю” (маўленчая дзейнасць), “прытуль-ваю” ( рух і стан прасторы). Якія яшчэ дзеянні называе дзеяслоў? (фізічная дзейнасць, разумовая, псіхічны стан чалавека, стан прыроды).

**IV. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага. Асэнсаванне.**

**1) Метад “Аўтобусны прыпынак”** ( праца ў групах).

**Настаўнік.** Мы будзем састаўляць кластар, галоўнае слова ў якім – “дзеяслоў”.

А) Працаваць будзем у групах. Кожная група атрымае картку з назвай пэўнай тэмы. Неабходна раскрыць дадзеную тэму і прывесці прыклады.

**1 група –** Неазначальная форма дзеяслова, яе сінтаксічная роля; зваротныя і незваротныя дзеясловы.

**2 група –** Трыванні дзеяслова, правапіс дзеясловаў з суфіксамі – -ава- (-ява-), -ыва- (-іва-), -ва-, -оўва- (-ёўва-).

**3 група** – Лады дзеяслова; часы дзеяслова.

**Прэзентацыя кластараў.**

**2) Прыём “Рэдакцыя Маладзечанскай СШ № 1 імя Янкі Купалы” (“Творчая лабараторыя”)**

**1 група “Пісьменнікі”.** Складзіце невялікае сачыненне-разважанне (4 сказы) на тэму эпіграфа “Родная мова", выкарыстоўваючы дзеясловы абвеснага ладу.

**2 група “Рэдактары”.** Прыдумайце невялікі тэкст, які б пачынаўся адным са сказаў з дзеясловам умоўнага ладу (3 сказы).

Калі б я быў (ла) настаўнікам, то…

Калі б я быў (ла) класным кіраўніком 7 “В”, то…

Калі б я быў(ла) дырэктарам школы, то…

**3 група “Карэспандэнты”.** Бліц-інтэрв’ю “Мая мова”. Падбярыце дзеясловы да выказвання “Мову трэба …” **(любіць, берагчы, шанаваць, праслаўляць).** Пастаўце іх у форму загаднага ладу множнага ліку. Прыдумайце 3 сказы на гэту тэму.

**Прэзентацыя прац. Карэкцыя ведаў.**

***Фізкультхвілінка***

Той, хто лічыць сябе патрыётам,
Падыміся!
Той, хто ўдзячны зямлі Беларусі,
Пакланіся!
Хто лічыць сябе шчаслівым,
Усміхніся!
Хто да добрых ведаў імкнецца,
Пацягніся!
Хто сябру жадае дабра,
Прывітайся!
І хутчэй да кніг за стол
Вяртайся!

**3) Прыём “Апрані фразу”. Устаўце прапушчаныя словы.**

1. Спражэнне дзеясловаў – гэта… 2. Паводле асабовых канчаткаў дзеясловы дзеляцца на… 3. Пры вызначэнні спражэння дзеяслоў трэба паставіць у форме … асобы … ліку … часу, калі ён мае канчаткі …, …,

то адносіцца да I спражэння, а калі канчаткі …, … – да II спражэння. 4. Спражэнне дзеясловаў з ненаціскнымі канчаткамі вызначаецца па … форме. 5. Да II спражэння належаць…. 6. Усе астатнія – належаць да … спражэння. 7. Дзеясловы *есці, даць, бегчы* адносяцца да рознаспрагальных, бо … .

- Якія два спосабы вызначэння спражэння дзеяслова вы ведаеце?

Узаемаправерка.

**4) Прыём "Вызнач дзеяслоў" (заданне леарнінгапс). Праца ў пары.**

Размяркуйце дзеясловы па групах: 1 спражэнне, 2 спражэнне, рознаспрагальныя дзеясловы.

*Марыць, рабіць, гнаць, маляваць, будаваць, пісаць, чакаць,вучыць,бегчы, есці* (Адзін вучань на інтэрактыўнай дошцы, узаемаправерка.)

**4) Індывідуальная праца.** Два вучні на дошцы спрагаюць дзеясловы з эпіграфа "плачу" , "пяю".

- Што трэба ведаць, каб не памыліцца ў напісанні канчаткаў дзеясловаў 2-ой асобы множнага ліку цяперашняга часу? (пла´чаце, пеяце´) . Дапоўніць сваімі прыкладамі (несяце, бераце, везяце, даяце).

**Арфаграфічная хвілінка("Злаві памылку").**

- Прадоўжым выпрацоўку арфаграфічных уменняў. Узнавіце ў памяці алгарытмы правапісу дзеясловаў. Калі слова напісана правільна пляскаем у далоні, калі няправільна – ціха сядзім.

**Кіньце, сядзце, ударце, супакоівае, зачароўвае, прываблівае, перашэптываюцца, не здаровіцца, не чытаў, недабачыць.**

(Кіньце, сядзьце, ударце, супакойвае, зачароўвае, прываблівае, перашэптваюцца, нездаровіцца, не чытаў, недабачыць).

Праверка па ключы на слайдзе.

**V. Кантроль узроўню ведаў і ўменняў па тэме ўрока.**

**Прыём "Тэст-лато"**

**1. Адзначце дзеясловы, якія стаяць у пачатковай форме:**

А) ганарышся, мыешся, купаешся;

Б) адказваем, спішам, рыхтавалі;

В) думаць, цвісці, дапамагчы.

**2. Адзначце дзеясловы, якія з’яўляюцца зваротнымі:**

А) вучыцца, несціся, купацца;

Б) напішуць, спяваюць, гуляюць;

В) бегчы, есці, будаваць.

**3. Адзначце, якіх граматычных катэгорый не маюць дзеясловы:**

А) трывання; роду;

Б) склону, адушаўлёнасці (неадушаўлёнасці);

В) ладу, ліку.

**4. Вызначце рад дзеясловаў, якія абазначаюць працэсы разумовай дзейнасці**:

А) ганарыцца, бегчы, касіць;

Б) жыць, купацца, чытаць;

В) разважаць, думаць, пераконваць.

**5. Знайдзіце памылку ў вызначэнні ладу дзеяслова.**

А) Нецікава было б жыць, калі б чалавек нічога вакол сябе не бачыў. (Загадны лад)

Б) Не плач ніколі, не зайздросць, не злуй, спакойны будзь і нават – лепей не смейся.( Загадны лад.)

В) Кожнага яна засланяла ад крыўды і знявагі, заступалася за старых і небаракаў.(Абвесны лад.)

**6. Вызначце, што агульнага ў дзеясловах** *спрачаюцца, глядзяцца, непакояцца:*

А) інфінітыў, закончанае трыванне;

Б) 3-я асоба, адзіночны лік, цяперашні час, 2-е спражэнне, незакончанае трыванне;

В) 3-я асоба, множны лік, цяперашні час, зваротныя.

**7. Адзначце дзеясловы, якія з *не* пішуцца разам:**

А) (не)навідзець, (не)дагаворваць, ( не)пакоіцца;

Б) (не)напісаць, (не)дакрануцца, (не)думаць;

В) (не)ісці, (не)радавацца, (не)дагнаць.

**8.Адзначце варыянт, у якім усе дзеясловы напісаны правільна:**

А) радаваць, прачытаць, бярагчы, ня воліць;

Б) святкаваць, адрозніваць, пішуць, ненавідзець;

В) падмарожываць, не пакоіць, катаца, зялянець.

**9. Вызначце дзеясловы, якія ўтвораны ад назоўнікаў суфіксальным спосабам:**

А) працаваць, друкаваць;

Б) пагарэць, цямнець;

В) адшукаць, размежаваць.

**10. Адзначце правільна перакладзенае словазлучэнне.**

Собираться по ягоды, послать за водой, благодарить учителя:

А) збірацца ў ягады;

Б) паслаць за вадой;

В) дзякаваць настаўніка.

Адказы: 1 – в, 2 – а, 3 – б, 4 – в, 5 – а, 6 – в, 7 – а, 8 – б, 9 – а, 10 – а.

**VI Карэкцыя ведаў. Самаацэнка.**

**VII. Падвядзенне вынікаў урока. Выстаўленне адзнак.**

**VIII. Рэфлексія.**

**Настаўнік.** Развітацца з вамі хочацца радкамі з верша “Дзесяць запаведзяў” Віктара Шведа:

Мову родную беражы,
Мовай роднай даражы,
мову родную шануй.
Мовай роднай не гандлюй,
Мову родную любі.
Мову ў сэрцы не губі.
Мовы роднай не кідай.
Мову дзецям перадай.
Мовы не аддай на здзек.

Толькі з ёй жыцьмеш, чалавек.

**Прыём “Алфавіт”.** Паспрабуйце падабраць прыклады дзеясловаў прошлага часу на кожную з літар, якія характарызавалі б вашу дзейнасць на ўроку.

**Д** - думаў, дзейнічаў

**З** - зразумеў

**Е** - еднасць

**Я** - якасна працавала (ў)

**С** - слухала(ў)

**Л** - ленавалася (ў)

**О (А)** - абагульняла (ў)

**Ў(у)** - удумвалася

– Я вельмі ўдзячная вам, дзеці, за плённую працу на ўроку, а таксама ўсім прысутным, хто далучыўся да нашай работы.

(Звяртаюся да **“Прагнозу надвор’я”)**

*У акіяне слова – ані межы, ні донца. Ёсць там адна аснова: праца і праца бясконца.*

**IX. Дамашняе заданне (каментар).** З верша “Ручэй” Я. Коласа (падручнік па бел. літ.) выпісаць 3 дзеясловы і зрабіць іх марфалагічны разбор.

**X. Акрэсленне задач на наступны ўрок.**

(Прэзентацыя да ўрока)

Дадатак 6

QR-код. Методыка дыягностыкі вучэбнай матывацыі Л.М. Фрыдмана.